**S.F. But-Gusaim**
Brest State University named after A.S. Pushkin
e-mail svfbg@tut.by

**Poetonymicon of Georgy Marchuk's dramatic novel "Algirdas"**

*Key words: literary onomastics, onym, anthroponym, poetonym, toponym, biblionym.*

*The article examines the poetonyms used in Georgy Marchuk's dramatic story, which are carriers of valuable information about the material and spiritual culture of Belarusians. Anthroponyms are considered as significant informative units, the semantic structure of which includes a pragmatic component, stylistic, emotional, evaluative, expressive, social shades of meaning, associations and other extralinguistic information. The cultural and historical connotations of the names of settlements, holidays, deities perceived against the background of historical associations, actualized in the context of the work, are described. Special attention is paid to understanding the role of context in revealing the semantic and emotionally expressive possibilities of poetonyms.*

**Л.С. Васюковіч**
Віцебскі філіял Міжнароднага ўніверсітэта "МІТСО"
e-mail: vasuk.mila@tut.by

УДК 811.161.3′367.3

# ТЭКСТ КУЛЬТУРЫ ЯК ГРАМАДСКАЯ І АСОБАСНАЯ КАШТОЎНАСЦЬ У СІСТЭМЕ ШКОЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ

*Ключавыя словы: тэкст, тэкст культуры, школьная адукацыя, аксіялагічны падыход, рэпрэзентант культуры.*

*У артыкуле тэкст культуры разглядаецца аўтарам як кампанент зместу школьнай адукацыі ў рэчышчы аксіялагічнага падыходу. Тэксты культуры акумулююць памяць пра "вечныя" каштоўнасці грамадскай супольнасці, праектуюць мадэль сучаснай адукацыі як працэс трансляцыі ўзораў культуры, прадвызначаюць маральныя якасці асобы.*

Праблема вызначэння ролі тэксту ў гуманітарнай сферы, у сучасным адукацыйным асяроддзі не толькі не вычарпала сябе, але і набыла новае гучанне. Праблема не страчвае актуальнасці ва ўмовах мадыфікацый філасофска-аксіялагічных каардынат сучаснага інфармацыйнага грамадства. На думку Н.Б. Цітовай, "сучасны перыяд развіцця чалавецтва ад індустрыяльнага грамадства да постіндустрыяльнага патрабуе

перагляду асноўных парадыгмаў зместу, арганізацыі адукацыі і тэхналогіі выкладання” [9, с.239]. На фоне дыялектычна зменлівых адукацыйных тэхналогій трансфармуецца і само паняцце тэксту.

Сучаснае разуменне, асэнсаванне тэксту – вынік эвалюцыі паняцця, якое першасна фарміравалася ў межах лінгвістычнай тэорыі: “Паведамленне, што існуе ў выглядзе такой паслядоўнасці знакаў, якая валодае фармальнай звязнасцю, зместавай цэласнасцю і фармальна-семантычнай структурай” [8, с.5]. Метадалагічны пераход ад лінгвацэнтрызму да тэкстацэнтрызму ўвасобіўся ў трактоўцы тэксту як з’явы культуры ва ўмовах каштоўнаснай ацэнкі ведаў і адукацыі. На сённяшні дзень айчынныя і замежныя вучоныя прызнаюць у тэксце метадалагічны і метадычны цэнтр кніжнасці; культурную з’яву, што ўтрымлівае інфармацыю і сэнс; каштоўнасную мадэль рэчаіснасці, рэалізаваную ў знакавых сістэмах; прадукт, які адлюстроўвае рух чалавечай думкі і спосабы яе праяўлення ( А.Д. Дзейкіна, В.А. Маслава, Н.Л. Мішаціна, С.У. Нікалаенка, В.Ф. Русецкі, М.Г. Яленскі і інш.).

Тэксты культуры выступаюць носьбітамі калектыўнай памяці, матэрыялізаванай ў “агульнакультурным” мінулым. Прызнаны сродак самаідэнтыфікацыі, рэсурс “фарміравання культурных арыенціраў” [4, с. 67] выступае формай выяўлення этнакультурнай памяці. Падобныя тэксты кандэнсуюць, захоўваюць духоўную спадчыну, агульнапрынятыя нормы соцыуму, праецыруюць сучаснае разуменне адукацыі як асобаснага вопыту засваення інфармацыйнай, рэфлексійнай культуры. У межах аксіялагічных каардынат адукацыя інтэрпрэтуецца як асобасная, грамадская, дзяржаўная каштоўнасць, а не толькі як сукупнасць прадметных ведаў. Паводле пераканання І.В. Арнольд, “культурная памяць ад пакалення да пакалення перадаецца часткова праз гены, але ў большай ступені ў тэкстах” [1, с. 9].

Засваенне тэкстаў памяці як культурных узораў ведаў, каштоўнасцей садзейнічае асэнсаванню ролі гістарычнай спадчыны. Першынство ў даследаванні памяці як феномена культуры, безумоўна, належыць Ю.М. Лотману, які яшчэ ў 1981 годзе пісаў пра міф, архетып, тэкст як формы памяці, што складаюць “энцыклапедыю архетыпаў”. Вучоны сцвярджае, што міфы і фальклор як культурныя тэксты XX стагоддзя “не супрацьпастаўляюцца каштоўнасцям наступных эпох, а расцэньваюцца як найвышэйшае дасягненне сусветнай культуры” [7, с. 55]. Эвалюцыя поглядаў лагічна прывяла даследчыка да разумення тэксту як рэпрэзентанта культуры. Тэкст культуры як “генератар сэнсу, інтэлектуальная прылада, каб быць уключанай у дзейнасць, мае патрэбу ў субяседніку… Гэтае пытанне звязана з праблемай адносін тэксту да культурнага кантэксту. Культура – гэта не хаатычнае назапашванне тэкстаў, а складаная, іерархічна арганізаваная сістэма” [7, с. 70]. Якія б арыгінальныя і найноўшыя тэорыі тэксту ні былі б створаны, ён не павінен быць па-за кантэкстам культуры, разглядацца як самадастатковая ўніверсальная з’ява.

Сувязь паняццяў *тэксты культуры* і *памяць* падкрэсліваў акадэмік Д.С. Ліхачоў, які сцвярджаў, што "каштоўнасць культуры найперш вызначаецца тым, як яна ствралася, якая ў ёй «закладзена памяць» [6, с. 68]. Знакавыя тэксты высвечваюць неабходнасць адказных адносін да захавання культурнай памяці (гістарычнай, сацыяльнай, карпаратыўнай). Так, на сённяшні дзень назіраецца яўная незапатрабаванасць класічнай навукова-педагагічнай спадчыны для вырашэння праблем сучаснай агульнаадукацыйнай школы. У выніку "новае" часта аказваецца або "забытым старым", або перафармаціраваным у каардынатах абноўленай тэрміналогіі. Ігнараванне дасягненняў папярэднікаў адмоўна адбіваецца на развіцці педагагічнай тэорыі. Пра наступствы забыцця «культурнага пласта" папярэджваў акадэмік С.Ф. Ягораў: "Ніякая галіна навуковых ведаў не можа плённа развівацца без таго, каб час ад часу не азірацца на тое, што ўжо зроблена, крытычна-канструктыўна ацэньваць дасягнутае, вызначаць актуальныя для сучаснасці задачы інавацыйнага развіцця" [3, с. 73]. Менавіта веданне гісторыі навукі дазваляе асэнсаваць тэндэнцыі і перспектывы яе развіцця.

Паколькі "тэкст мёртвы без акта спазнання" [10, с. 23], ён прынцыпова дыялагічны. Адпаведна тэкст культуры найперш звязаны з інтэрпрэтацыяй, ацэнкай зместу, што актывізуе дзейнасць маўленчых партнёраў – стваральніка, інтэрпрэтатара. Паводле пазіцыі М.М. Бахціна, тэкст – не застылая сутнасць, а дыялог – паміж аўтарам, чытачом і культурным кантэкстам. Першасна тэкст запланаваны, спраецыраваны на зносіны, на ўзаемаразуменне. Дыялагічнасць тэкставай прыроды выяўляецца ў тым, што "любы тэкст з'яўляецца рэакцыяй у адказ, усякае разуменне тэксту ёсць суаднесенасць яго з іншымі выказваннямі" [2, с. 91]. Паводле канцэпцыі М.М. Бахціна, тэкст разглядаецца ў рэчышчы далучанасці, знітаванасці з вядучай ідэяй існавання асобы ў кантэксце культуры. Адпаведна ў сферу культуры арганічна ўваходзіць вобраз суб'екта, індывідуума, а сам тэкст становіцца метафарай культуры. Прааналізаваныя, асэнсаваныя, створаныя тэксты з'яўляюцца своеасаблівым ключом да спасціжэння крэатыўнай сутнасці чалавека. Прачытаныя, засвоеныя тэксты складаюць аснову разумення і пазнання, ствараюць тэкставую карціну свету, асноўнымі рысамі якой з'яўляюцца дыялагічнасць, камунікатыўнасць, знакавасць, каштоўнаснасць.

Практыка абнаўлення сучаснай школьнай адукацыі абумоўлена новымі фарматамі тэксту. Так, у рэчышчы міжнародных даследаванняў (у 2022 годзе прымала ўдзел 81 краіна) адукацыйных вынікаў 15-гадовых школьнікаў PISA кантрольна-вымяральныя матэрыялы ўключалі тэксты мастацкай, дзелавой, навуковай, бытавой сферы, рэпрэзентаваныя рознафарматнымі адзінкамі. На думку прафесара Санкт-Пецярбургскага ўніверсітэта А.І. Казаковай, тэксты новай прыроды ўяўляюць "шырокую групу тэкставых структур, адрозных ад традыцыйных, …у якіх

выкарыстоўваецца паслядоўнасць разнародных сімвалаў, знакаў вербальнага і невербальнага паходжання” [5, с. 9]. Развіццё тэкстаў новай прыроды – спроба пошукаў альтэрнатывы славеснаму навучанню, імкненне супрацьстаяць рэпрадуктыўна-рэцэптурнай методыцы.

У кантэксце прызнання візуальнасці як стрыжня сучаснай культуры адзінкі новай прыроды, якія арганічна інтэгрыруюць слова, анімацыю, малюнак, інфаграфіку, патрабуюць назапашвання вопыту працы з тэкстамі мультымадальнага фармату. Напрыклад, сучасныя школьныя падручнікі ўтрымліваюць дастаткова вялікую колькасць малюнкаў, фотаздымкаў, якія частотна ўяўляюць сабой толькі знешні антураж, дэкарацыйны кампанент выдання. Падобныя невербальныя знакі, разлічаныя на карыстальнікаў лічбавага пакалення, павінны забяспечваць інфармацыйна-насычаную прастору.

Шырокай распаўсюджанасці новых фарматаў тэкстаў спрыяюць наступныя фактары:

– актуалізацыя ролі Інтэрнэту ў кантэксце культурных запатрабаванняў асобы;

– стандартызацыя і паскарэнне стандартаў зносін;

– шматпланавасць і шматзначнасць форм сучаснай камунікацыі;

– арыентацыя сучасных школьнікаў на прадукты экраннай культуры;

– спроба выйсці за межы традыцыйна-вербальнага канона прадстаўлення інфармацыі.

Фотаздымак уяўляе сабой гамагенны тэкст, стварае адзінае сэнсава-функцыянальнае цэлае ў камунікатыўным полі. Нягледзячы на тое, што фатаграфія толькі аснова для камунікатыўных зносін, яна – неабходны складнік гэтага працэсу. Фота – шматфункцыянальны кампанент адукацыйнай прасторы, які шматаспектна раскрывае адлюстраваную падзею, з’яву, факт. Фотаздымак выступае як памяць пра мінулае, факт мастацкай версіі рэальнага жыцця, успамін, што суправаджаецца станоўчымі ці адмоўнымі эмоцыямі, з’яўляецца спосабам самавыяўлення, характарыстыкай асобы. Фотаздымак як сродак камунікавання “прымушае” трымаць у памяці і прыгадваць у адпаведны момант жыццёвыя абставіны, шчаслівыя моманты або праблемы ва ўзаемаадносінах з іншымі членамі найбліжэйшага сямейнага круга.

Аналіз фотарада айчынных падручнікаў сведчыць пра выпадковы характар яго напаўнення. У ідэале невербальны кампанент школьных дапаможнікаў павінен выконваць сэнсавую, культуралагічную нагрузку. Набор візуальных вобразаў не павінен запаўняцца, зыходзячы з густаў складальнікаў. Візуальны імідж выдання выступае свайго роду візітоўкай для сучаснага чытача. Тым больш, што сучасныя школьнікі ў працэсе пошуку інфармацыі найперш “скануюць” невербальныя звесткі. Фотаздымак выступае камунікатыўным феноменам, паколькі змест адлюстраванага фармулюецца словамі, а значыць, фотаздымак як тэкст культуры становіцца патэнцыяльным выказваннем.

Фарміраванне каштоўнасных арыентацый сродкамі падручніка ўключае засваенне вобразаў, канцэптаў, ключавых для разумення культуры грамадства. Цэласна распрацаваная і прадстаўленая ў падручніках мадэль візуалізацыі як сістэма сацыяльна-гуманітарных ведаў пра свет павінна трактавацца як выяўленне ідэі калектыўнай памяці, ідэнтычнасці беларусаў. Фотаздымак як факт культуры становіцца нагодай для ўспамінаў, разважанняў, ацэнак, інтэрпрэтацый.

Такім чынам, сённяшняя адукацыйная прастора становіцца для сучаснага школьніка адным з ключавых фактараў паспяховай сацыялізацыі. Ігнараванне гэтага факта можа паглыбіць разрыў паміж лічбавым пакаленнем і сучаснай сістэмай адукацыі. Прызнанне гэтага факта канцэнтруе ўвагу педагогаў на пошуку адэкватных трансфармацый і рашэнняў аб зменах у методыках навучання і выхавання сучаснай моладзі.

На думку псіхолагаў, актыўнае бытаванне ў інтэрнэт-прасторы фарміруе неабходнасць успрымаць інфармацыю невялікімі порцыямі, яна павінна прадстаўляцца сцісла, наглядна, суправаджацца невербальнымі кампанентамі. Альтэрнатывай інтэрнэт-залежных паводзін можа быць толькі школа з яе класічнай задачай – фарміраванне паняційнага мыслення, цэласнага ўспрымання з'яў, устанаўленне лагічных, прычынна-выніковых сувязей паміж імі. У метадычным арсенале сучаснага настаўніка павінны знаходзіцца класічныя прыёмы працы з тэкстамі культуры – класіфікацыя і параўнанне фактаў, вылучэнне галоўнай і другаснай інфармацыі, яе шматаспектны аналіз – з мэтай фарміравання свайго меркавання, уласнай пазіцыі, крытычнай ацэнкі фактаў, падзей, з'яў.

Такім чынам, тэксты культуры выступаюць інтэлектуальна-маральным рэсурсам сучаснай адукацыі, ствараюць аксіялагічныя асновы метадычнай навукі. Яна маюць:

– гістарычнае значэнне, паколькі сцвярджаюць эвалюцыйны характар сучаснай тэорыі тэксту, яе непарыўную сувязь з дасягненнямі мінулага;

– культуралагічнае значэнне: раскрываюць культуру як сістэму каштоўнасцей, што ўтвараюць духоўны стрыжань, квінтэсэнцыю патрэбнасцей індывіда і соцыуму, сукупнасць уяўленняў пра свет і ўзаемаадносіны паміж людзьмі;

– этычнае значэнне: тэксты культуры фарміруюць маральна-этычныя асновы быцця, павагу, удзячнасць, любоў да блізкіх, да малой і вялікай Радзімы, да каштоўнасцей, створаных папярэднікамі;

– сацыяльнае значэнне: тэксты культуры забяспечваюць сувязь між пакаленнямі праз адзінае культурнае поле, што ўзнаўляе агульна прызнаныя эталоны, стандарты паспяховых грамадскіх зносін;

– прагнастычнае значэнне: прадвызначаюць перспектывы, пераемнасць ідэй, дасягненняў педагогікі, методыкі выкладання на розных этапах станаўлення нацыянальнай школы.

Такім чынам, культура XXI стагоддзя характарызуецца павышанай увагай да феномена тэксту. Логіка эвалюцыі паняцця тэкст абумоўлена канцэптуальнымі зрухамі ал лінгвістычнай сутнасці адзінкі да выяўлення анталагічных асаблівасцей тэксту як носьбіта сэнсу, каштоўнасцей, індывідуальнай тэкставай карціны свету.

Тэксты культуры дэманструюць сінтэз, узаемадзеянне і ўзаемасувязь культуры і мовы, адлюстроўваюць цэласнасць моўнага і культурнага зместу адзінкі, арыентацыю на сучасныя культурныя ўстаноўкі як сістэму агульначалавечых каштоўнасцей. Яны закліканы фарміраваць воблік адукаванага чалавека, здольнага жыць у гармоніі з нормамі і культурай свайго часу.

Менавіта тэксты культуры выконваюць ролю вядучага кампанента зместу школьнай адукацыі, арыентаванай на прызнанне роднай мовы як культурна-нацыянальнага феномена, забяспечваюць фарміраванне каштоўнасных прыярытэтаў:

– моўная/філалагічная адукацыя выконвае грамадскую і асобасную місію ў выхаванні асобы;

– аксіялагічныя ідэі павінны ўсведамляцца як інтэграваныя ў рэчышчы метадычных падыходаў;

– тэкст культуры выступае ў якасці дамінанты фарміравання каштоўнасных арыентацый вучняў, з'яўляецца сродкам рэалізацыі духоўна-маральных традыцый у сістэме адукацыі.

**Літаратура**


1. Арнольд, И.В. Память / И.В. Арнольд // Чествуя филолога: сборник статей. – Орел: ОГУ, 2002. – С. 9–14.
2. Бахтин, М.М. Эстетика словесного творчества /М. М. Бахтин. – 2-е изд. – М.: Искусство, 1986. – 444 с.
3. Егоров, С.Ф. Исследования истории отечественной педагогики: вчера и сегодня / С.Ф. Егоров // Педагогика. – 2009. – № 5. – С. 73–79.
4. Загрязкина, Т.Ю. Этнотекст в контексте эпилингвистического дискурса / Т.Ю. Загрязкина // Язык и действительность: сборник статей по итогам Международной конференции. – М.: Наука, 2016. – С. 66–70.
5. Казакова, Е.И. Тексты новой природы: закономерности и технологии развития современной грамотности в условиях качественной модернизации современного текста / Е.И. Казакова // На путях к новой школе. – 2014. – № 1. – С. 4 – 12.
6. Лихачев, Д.С. Искусство памяти и и память искусства / Д.С. Лихачев // Прошлое – будущему: статьи и очерки. – Л.: Наука, 1985. – С. 63–69.
7. Лотман, Ю. М. Статьи по семиотике культуры и искусства / Сост. Р.Г. Григорьева. – СПб.: Академический проект, 2002. – 544 с.
8. Лукин, В.А. Художественный текст. Основы лингвистической теории и элементы анализа / В.А. Лукин. – М.: Ось-89, 1999. – 192 с.
9. Титова, Н.Б. Современное образование: качество знания или имитация? / Н.Б. Титова // Актуальные проблемы социологии молодежи, культуры, образования и управления: материалы международной конференции; Екатеринбург, 28 февраля 2014 г. – Екатеринбург: УрФУ. – Т.3. – 2014. – С. 239 – 240.
10. Тураева, З.Я. От мастерства писателя к открытиям читателя: в поисках сущности текста / З.Я. Тураева. – М.: ЛЕНАНД, 2016. – 137 с.

**L.S. Vasyukovich**
Vitebsk branch of the International University “MITSO”
e-mail vasuk.mila@tut.by

## The text of culture as a social and personal value in the school education system

*Key words: text, cultural text, school education, axiological approach, cultural representative.*

*In the article the text of culture is considered by the author as a component of the content of school education in the context of the axiological approach. Cultural texts accumulate the memory of the “eternal” values of society, design a model of modern education as a process of transmitting cultural samples, and predetermine the moral qualities of an individual.*

**Г.А. Гладкова**
Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава
e-mail: anngrin@mail.ru

УДК 371.3:821.161.3

## ВЫХАВАЎЧЫ ПАТЭНЦЫЯЛ ТВОРАЎ Г. МАРЧУКА Ў ШКОЛЬНЫМ ВЫКЛАДАННІ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

*Ключавыя словы: метадычны прыём, выхаванне, жанр, канон, мастацкі вобраз, кластар, квіз-віктарына.*

*У артыкуле разглядаюцца мастацкія творы Г. Марчука “Канон Маці”, “Канон Гарыні” ў аспекце выхавання ў вучняў пачуцця любові да радзімы, павагі да сям’і і эстэтычнага ўспрымання прыроды беларускага краю. Значная ўвага надаецца інавацыйным прыёмам навучання, якія спрыяюць актывізацыі чытацкай зацікаўленасці і дапамагаюць эфектыўна ацаніць працу вучняў на ўроку.*

Сучасная метадычная навука інтэнсіўна развіваецца за кошт успрымання і адаптацыі многіх інавацыйных прыёмаў, якія часам запазычваюцца з сумежных відаў мастацтва (напрыклад, буктрэйлер узнік па аналогіі з трэйлерам відэапрадукцыі). Мадалому пакаленню чытачоў натуральна ўспрымаць мастацкі твор літаратуры праз дадатковыя прыёмы, якія спрыяюць павышэнню чытацкай зацікаўленасці, таму настаўнікі-філолагі імкнуцца актыўна выкарыстоўваць у прафесійнай дзейнасці інавацыйныя метадычныя знаходкі. Мэта артыкула – выявіць выхаваўчы патэнцыял твораў Г. Марчука, прапанаваных для вывучэння ў 11 класе, а таксама ахарактрызаваць прымяненне інавацыйных прыёмаў павышэння чытацкай зацікаўленасці на дадзеным мастацкім матэрыяле.